# Культура мовы. Нормы літаратурнай мовы

- Тэрмін **«культура маўлення»** мае два значэнні:
1) сістэма камунікатыўных якасцей маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, багацце і разнастайнасць, дарэчнасць, чыстата і лаканічнасць);
2) вучэнне пра сістэму камунікатыўных якасцей маўлення.

**Правільнасць маўлення** прадугледжвае захаванне носьбітамі мовы літаратурнай нормы, што забяспечвае адзінства моўных сродкаў і ўзаемаразуменне паміж тымі, хто вядзе гаворку.

**Правільнае маўленне** – гэта маўленне з захаваннем норм літаратурнай мовы. Моўныя нормы – гэта замацаваныя ў маўленчай практыцы правілы вымаўлення, словаўжывання, пабудовы сказаў і тэкстаў.

**Арфаэпічныя нормы** патрабуюць ад усіх носьбітаў мовы адзінага вымаўлення гукаў, гуказлучэнняў у словах і спалучэннях слоў.

Правільнае літаратурнае вымаўленне – істотная адзнака культуры маўлення і культуры чалавека ўвогуле.

**Акцэнталагічныя нормы** рэгулююць месца размяшчэння націску ў словах (напрыклад, трэба *кварт'ал*, нельга *кв'артал*).Побач з літаратурнай нормай сустракаюцца акцэнтныя варыянты, якія існуюць паралельна з нарматыўнымі (*над'алей – надал'ей*), і тыя, якія выходзяць за рамкі нормы (*ж'ыхар – жых'ар*), што звязаны з пранікненнем у літаратурную мову дыялектных слоў.

**Словаўтваральныя нормы** ахоўваюць найбольш трывалыя, традыцыйныя ў беларускай літаратурнай мове словаўтваральныя тыпы – схемы пабудовы слоў пэўнай часціны мовы.

Напрыклад, пры ўтварэнні аддзеяслоўных назоўнікаў, што абазначаюць асоб па дзеянні, названым утваральным словам з' ўляецца суфікс –льнік (*збіраць- збіральнік*), таму намінацыі тыпу *збірацель, стварацель* – адхіленне ад нормы.

**Марфалагічныя нормы** замацоўваюць правільнае выкарыстанне моўных сродкаў паводле іх прыналежнасці да пэўных зменных часцін мовы. Ужыванне слоў з неўласцівымі формамі роду (*залатая медаль, свойскі гусь*), ліку (*праменні, карэнні*) і ва ўтварэнні ступеняў параўнання (*вышэй мяне, старэй мяне*) і інш.; ва ўжыванні складанай формы прошлага часу (*яна была пайшла*).

**Сінтаксічныя нормы** рэгулююць граматычную сувязь слоў, забяспечваюць правільнасць формы кіравання і дапасавання. Пашырана варыянтнасць спосабаў выражэння (дапускаецца: водзыў на аўтарэферат і водзыў аб аўтарэфераце). Існуе выразная розніца паміж формамі *звяртаць (накіроўваць) увагу на каго, на што* і *засяроджваць увагу на кім, на чым.* Часта дапускаюцца памылкі і пры выбары граматычнай формы дапасавання *(тры вялікіх дуба,*
*два поўных мяшкі).*

**Фразеалагічныя нормы** рэгулююць традыцыйнае, замацаванае вуснай і пісьмовай практыкай ужыванне фразеалагізмаў з характэрнымі для іх структурна-граматычнымі, семантычнымі і спалучальнымі асаблівасцямі.

*Мармытаў пад носам дзіцячыя песні.*

МОВА НАНОВА

**Лексічныя нормы** выводзяць за рамкі ўжывання тыя адзінкі, якіх не прымае літаратурнамоўная практыка. Напрыклад: *архаічнасці вясковага жыцця – старадаўнасць вясковага жыцця.*

**Стылістычныя нормы** рэгулююць арганізацыю маўлення ў плане выбару не толькі пэўных слоў і сінтаксічных канструкцый, але і марфалагічных формаў. Як вядома, кожны стыль мае свае нормы, свае, адметныя ад іншых стыляў, моўныя сродкі.

# Устанавіце адпаведнасць

А. Арфаграфічныя нормы.

Б. Лексічныя нормы.

В. Сінтаксічныя нормы.

Г. Марфалагічныя нормы.

А3Б1В2Г4

1. Правільны выбар слова і дарэчнасць яго прымянення.

2. Правільная пабудова словазлучэнняў, сказаў, тэкстаў.

3. Правільнае напісанне слоў

Кроў піць –
абіваць бакі –
ляжаць на баку –
у адзін голас –
туман пускаць –

крывапівец
абібок
лежабок
адзінагалосна
атуманьваць.

Голад не цётка, бяздонная бочка.

Голад не цётка, піражка не падасць .
Бяздонную бочку вадой не напоўніш.
Пра нябожчыка або добрае або нічога акрамя праўды.

**чарнець** - станавіцца чорным, чарнейшым (чарнець ад сажы)
**чарніць** - рабіць што-небудзь чорным (чарніць фарбай)
**карыслівы** - прагны да нажывы, карысталюбівы (карыслівы чыноўнік)
**карысны** - які прыносіць карысць (карысны напой)
**адрасат** - той, каму адрасавана паштовае адпраўленне (далёкі адрасат)
**адрасант** - той, хто пасылае паштовае адпраўленне, адпраўнік (незнаёмы адрасант)
**абагуліць** - зрабіць асабістае, уласнае калектыўным, грамадскім (абагулілі ў вёсцы гаспадарку)
**абагульніць** - знаходзіць агульнае і на падставе гэтага рабіць вывад (абагульніць веды па тэме)
**дыпламат** - службовая асоба (дыпламат у нашай краіне)
**дыпламант** - удзельнік конкурсу, узнагароджаны дыпломам (дыпламант конкурсу)

**Знайдзіце словы, якія не адпавядаюць кантэксту:**

1. Прыйшлі ў лес, паставілі палаткі і расклалі вялікае полымя.
2. Здавалася, што ўся ляснікавая жыўнасць павымірала ці, у лепшым выпадку, пазашывалася ў расколіны і норы, пад іржавую асаку.
3. Як ніколі, трывога абвалакла гэтай ноччу Ганну.
4. Ты вышэй за той парог, аб які натыкаецца большасць.
5. Мы с табою не ўсё дасказалі, бо разбегліся трассы ў чатыры бакі.

**Знайдзіце словы, якія не адпавядаюць кантэксту**:

1. Прыйшлі ў лес, паставілі палаткі і расклалі вялікае вогнішча.
2. Здавалася, што ўся лясная жыўнасць павымірала ці, у лепшым выпадку, пазашывалася ў расколіны і норы, пад іржавую асаку.
3. Як ніколі, трывога агарнула гэтай ноччу Ганну.
4. Ты вышэй за той парог, аб які спатыкаецца большасць.
5. Мы с табою не ўсё дасказалі, бо разбегліся сцежкі ў чатыры бакі.

**2 .Выпраўце памылкі ў фразеалагізмах.**

Кідаць словы на вецер.

З ваўкамі жыць – па-воўчы выць.

Дурня хоць царом пастаў – дурнем і застанецца.

Два мядзведзі ў адной бярлозе  не жывуць.

Добрая слава ў кошыку ляжыць, а благая па дарожцы бяжыць.

**3. Знайдзіце словы, у якіх граматычная форма не адпавядае правілам і выпраўце памылкі.**

1) Асноўнай адметнасцю яго твар**у** быў невялікі шрам.

2) Кот кінуўся за мыш**шу** і скінуў са стала слоік са смятанай.

3) Удыхнуў паветра **поўнымі грудзямі**, і на душы стала лягчэй.

4) Збіраючы чарні**цы**, дзяўчынка пільна прыглядалася да наваколля.

5) Назіраючы, як дзіця працуе на полі, жанчыну агарну**ў** та**кі** жаль.

6) Старэйшы **за** сястр**у** Міколка адразу зразумеў, што трэба рабіць.

МОВА НАНОВА

МОВА НАНОВА

МОВА НАНОВА

МОВА НАНОВА

МОВА
НАНОВА